УДК 94(73) "1861/1863"

# АДНОСІНЫ КАНФЕДЭРАТЫЎНЫХ ШТАТАЎ І ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ УПЕРШЫ ПЕРЫЯД ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ (красавік 1861–студзень 1863 гг.)

# RELATIONSHIPS OF THE CONFEDERAT STATES AND THE UNITED STATES IN THE FIRST PERIOD OF THE CIVIL WAR (april 1861–january 1863)

***Я. С. Ермакоў***
*магістрант,*
*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны,*
*Гомель, Рэспубліка Беларусь*

***J. Jermakou***
*Post-Graduate Student,*
*Gomel State University named after F. Skaryna,*
*Gomel, Republic of Belarus*

У артыкуле раскрываюцца асобныя праблемныя моманты ўзаемаадносін паміж Канфедэрацыяй і Злучанымі Штатамі ў першы перыяд Грамадзянскай вайны. Аўтарам аналізуюцц асноўныя напрамкі дзейнасці бакоў, іх змест і сутнасць у дачыненні да разгледжаных праблем. Канстатуецца, што ЗША былі больш паспяховым і ў іх вырашэнні, што ў вядомай ступені і прадвызначыла іхнюю перамогу ў вайне.

The article reveals some problematic aspects of the relationship between the Confederation and the United States in the first period of the Civil War. The author analyzes the main activities of the parties and their content and essence in relation to the problems under consideration. It is stated that the United States was more successful in their decision, which, to some extent, predetermined their victory in the war.

*Ключавыя словы:* канфедэрацыя; ЗША; «пагранічныя штаты»; блакада; рабаўладанне; пракламацыя.

*Keywords:* Confederation; USA; «Border States»; blockade; slavery; proclamation.

Грамадзянская вайна (1861–1865 гг.) якасна змяніла адносіны паміж Канфедэрацыяй і ЗША. Зразумела, што ў дадзенай сітуацыі ніякія кантакты паміж імі немагчыма было ўжо наладзіць. Аднак кіраўніцтва абодзвюх дзяржаў разумела, што цераз знешнепалітычныя дзеянні можна ўплываць не толькі на агульную ваенную сітуацыю, але на палітычную і міжнародную кан›юнктуру дзеля іх паляпшэння на сваю карысць. Мэта артыкула – у кантэксце знешнепалітычных дзеянняў і захадаў абодвух бакоў за першы перыяд Грамадзянскай вайны разгледзіць барацьбу за «пагранічныя штаты», сітуацыю вакол блакады партоў КША і праблему рабаўладання.

Перамогі арміі канфедэратаў у першых баях 1861 г. уплылі на тое, што зноў актывізаваўся сецэсійны рух паўднёвых штатаў ЗША. Гэта прывяло да трэцяй хвалі сецэсіі, якая ўвасобілася у барацьбу паміж КША і Злучанымі Штатамі за т.зв. «пагранічныя штаты» – Дэлавэр, Мэрыленд, Місуры, Кентукі, Вірджынія і іншыя штаты – Тэнэсі, Паўночная Караліна і Арканзас [1, с. 98; 2, с. 92–93]. Дадзеныя штаты, асабліва «пагранічныя штаты», мелі стратэгічнае значэнне як для Канфедэрацыі, так і для ЗША. Усе яны эканамічна былі блізкімі да штатаў Поўдня: тут знаходзілася тры чвэрці індустрыяльнай прамысловасці Поўдня, палова коней і мулоў, тры пятых хатняй скаціны і харчовых культур. Акрамя таго, тут жыло палова насельніцтва ад усіх паўднёвых штатаў і адсюль выходзіў шэраг знакамітых вайскоўцаў ЗША [3, p. 1–2].

Відавочна, што абодва бакі былі зацікаўлены ў гэтых штатах: для ўрада Дж. Дэвіса далучэнне большасці гэтых штатаў да Канфедэрацыі значыла б ўмацаванне сваіх сіл, а для ўрада А. Лінкальна – значнае аслабленне сіл праціўніка і ўмацаванне Саюза. Канфедэратыўны ўрад імкнуўся выкарыстоўваць ваенныя дзеянні для арганізацыі сецэсіі ці дапамогі тым штатам, якія ўжо пачалі яе арганізоўваць. Канцэпцыю дзеянняў у дачыненні да дадзеных штатаў была сфармулявана Дж. Дэвісам і іншымі канфедэратамі. Так, у сваім пасланні да Кангрэса ад 20 ліпеня 1861 г. ён зазначыў, што была выдадзена адмысловая пастанова, паводле якой жыхары «пагранічных штатаў» не лічацца ворагамі Канфедэрацыі. Апроч таго, Дж. Дэвіс выказаў меркаванне, што «вельмі вялікая частка насельніцтва дадзеных штатаў лічыць нас братамі... калі б не... грамадзянская вайна і аб›яўленне ваен-

нага становішча, некаторыя з іх... радасна аб'ядналіся б з намі» [4, p. 121–122]. Такім чынам, КША былі мэтанакіраваны да таго, каб далучыць іх да сябе.

Пасля выдання пракламацыі А. Лінкальна ад 15 красавіка, якая заклікала штаты ЗША даць неабходную колькасць вайскоўцаў, «пагранічныя штаты» адмовіліся выконваць яе [5, p. 276]. Так, губернатар штата Кентукі даў зразумець, што штат «не дасць ніякіх войскаў для злой мэты падпарадкаваць яе сёстры – паўднёвыя штаты» [6, p. 70]; губернатар штата Паўночная Караліна сказаў ваеннаму сакратару, што «вы не можаце атрымаць войскі з Паўночнай Каральны [7, p. 72]; падобныя адказы былі атрыманы ад губернатараў Вірджыніі, Тэнэсі, Арканзаса і Місуры, а Мэрыленд і Дэлавэр наогул праігнаравалі цэнтр [8, p. 76; 9, p. 81; 10, p. 83; 11, p. 99; 12, p. 303].

Для Канфедэрацыі важна было забяспечыць сабе перавагу, а гэтыя штаты маглі яе даць. Аднак улады Саюза паспелі правесці шэраг эфектыўных мер. Так, у штаце Мэрыленд федэральныя улады арыштавалі найбольш актыўных прыхільнікаў Канфедэрацыі, увялі ваеннае становішча ў Балтыморы, абмежавалі правы грамадзян штата [13, p. 334–337]. У красавіку федэральныя войскі фактычна акупавалі тэрыторыю гэтага штата [14, p. 44]. Да канца чэрвеня галоўныя сілы прыхільнікаў сецэсіі ў дадзеным штаце былі разгромлены, а сітуацыя нармалізавалася [15, c. 189].

У Дэлаверы пазіцыі сецэсіяністаў былі слабымі і іх хутка падавілі [15, c. 189]. У Вірджыніі Канвент штата, які арганізаваў прасецэсійны губеранатар, 17 красавіка 1861 г. паводле вынікаў галасавання (88 за, 55 супраць) прыняў арදананс аб выхадзе са складу Саюза [5, p. 279]. Аднак графствы заходняй часткі штата не прызналі ўлады КША. 20 чэрвеня у г. Уіліг сабраўся Канвент, які 29 жніўня абвясціў аб стварэнні асобнага штата Заходняя Вірджынія, які ўступіў у ЗША ў 1863 г. [16, c. 120].

У маі 1861 г. пачалася барацьба за штаты Тэнэсі, Паўночная Караліна і Арканзас. 6–7 мая легістратура штатаў Тэнэсі і Арканзас прынялі арданнансы аб выхадзе з краіны, а 20 – тое ж самае зрабіў і Канвент Паўночнай Караліны. К канцу мая – пачатку чэрвеня ўсе вышэй пералічаныя штаты аказаліся ў складзе Канфедэрацыі, дзе стала 11 штатаў [14, p. 42].

Складаная сітуацыя была з Кентукі і Місуры. Калі канфедэратыўныя войскі ў восені 1861 г. занялі частку штата Кентукі, там сабраўся Канвент, які 20 лістапада таго ж года ухваліў арданнанс аб сецэсіі. У штаце Місуры 20 красавіка пачалася фактычна грамадзянская вайна. Вызначыліся два бакі: сецэсіяністы, якіх узначаліў губернатар К.Ф. Джэксан, і юніяністы на чале з Канвентам. Перамогу атрымалі юніяністы, губернатар збег са сталіцы да арканзаскай мяжы, дзе 28 кастрычніка прыняла арданнанс аб сецэсіі [17, c. 9]. Завязалася партызанская барацьба паміж прыхільнікамі Канфедэрацыі і Саюза, а выніку чаго легістратура штата 28 кастрычніка прыняла арданнанс аб сецэсіі дадзенага штата [16, c. 120].

У сваё прамове да Кангрэса 18 лістапада 1861 г. Дж. Дэвіс значную ўвагу надаў сітуацыі вакол апошніх дзвюх штатаў. Паводле яго меркавання, Саюз адмаўляў правы гэтых штатаў на нейтралітэт, асабліва на нейтралітэт Кентукі. Менавіта таму войскі Канфедэрацыі пайшлі «ў гэты штат, каб адбіць ворага і прадухіліць акупацыю некаторых стратэгічна важных кропак, якія ў будучыні далі б ім вялікія перавагі ў вайне – крок, які быў апраўданы, а не толькі па неабходнасці самаабароны з боку Злучаных Штатаў, аднак, таксама... каб дапамагчы жыхарам Кентукі» [18, p. 414–415]. У лістападзе 1861 г. ў Канфедэрацыю як 12-ты штат ўступіла Місуры, а ў снежні як 13-ты – Кентукі. Аднак у рэальнасці гэтыя штаты знаходзіліся па-за межамі КША, бо ні як не ўплывалі на палітычную сітуацыю ў краіне [19, c. 120].

Лідары Канфедэрацыі разумелі сваё больш горшае эканамічнае становішча ў параўнанні са Злучанымі Штатамі, таму шукалі крыніцы фінансавання па-за сваёй краіны, што прывяло іх да краін Еўропы, і ў першую чаргу – да Англіі. Дадзены аспект знешняй палітыкі Канфедэрацыі ў гістарыяграфіі прынята называць «бавоўнянай дыпламатыяй» ці «дыпламатыяй Караля бавоўны» [20, p. 68]. Рэалізацыя такой палітыкі пачалася 17 красавіка 1861 г., калі ўрад КША абвясціў Поўдзень зонай свабоднага гандлю і выдаў прывілеі ўсім сваім судам на каперства, каб весці барацьбу з ваеннымі і гандлёвымі судамі ЗША [21, p. 60–62]. Вашынгтон разумеў, што калі Мантгомеры атрымае дапамогу ад іншых краін, то гэта ў значнай ступені адмоўна адаб'ецца на агульнай ваеннай сітуацыі. Таму 19 красавіка А. Лінкальнам была абвешчана гандлёвая блакада паўднёвых партоў [22, p. 89].

Згодна адмысловай пракламацыі блакада ўводзілася для прадухілення дзеянняў паўднёвых капераў і «абароны... жыцця і ўласнасці... грамадзян». Блакіраванню падлягаглі парты штатаў Паўднёвай Караліны, Джорджыі, Алабамы, Фларыды, Місісіпі, Луізіяны і Тэхас, а ў далейшым блакада была распаўсюджана і на іншыя штаты Канфедэрацыі, якія мелі выхад да марскіх водаў – Вірджынія і Паўночная Караліна [23; 24]. Апроч таго, 16 жніўня А. Лінкальн наогул выдаў пракламацыю аб прыпыненні камерцыйнага гандлю з Канфедэрацыяй, які забараняў перасоўвання тавараў са штатаў КША ў любыя часткі Злучаных Штатаў без «адмысловай ліцэнзіі і дазволу прэзідэнта» [25].

З нагоды ўсталявання блакады Дж. Дэвіс ў адным са сваіх пасланняў да Кангрэса адзначыў неправамернасць дадзенай меры. Паводле ягоных слоў, гэта ігнаруе «звычаі цывілізаваных народаў і адкры-

вае вайну на знішчэнне з абодвух бакоў» [26, p. 76]. Было зразумела, што Канфедэрацыя зробіць шэраг захадаў для мінімізацыі наступстваў блакады, бо яна пагаршыла пастаўку бавоўны ў Англію і да іншых еўрапейскіх краін, а таксама пастаўку фуражу, зброі і правіянту да арміі Канфедэрацыі. Так, калі лічба экспарту бавоўны ў 1860 г. у далярах была 202 млн, у 1861 г. – 42 млн, а ў 1861 г. наогул склала 400 тыс. [27, p. 132]. Аднак першыя асобы КША спачатку лічылі, што блакада, наадварот, будзе толькі ім на руку. Так, Дж. Дэвіс звязваў свае спадзяванні з узнікненнем бавяўнянага голаду ў краінах Еўропы, які б падштурхнуў іх на прызнанне Канфедэрацыі і дапамогу ёй [28, c. 241]. Дадзенае спадзяванне рэалізавалася ў акце ад 21 мая 1861 г. У адпаведнасці з ім было ўведзена абмежаванне экспарту бавоўны, які мог быць здзейснены толькі праз парты КША [29, p. 152–153].

Блакада Саюза і адказ на яе з боку Канфедэрацыі мелі наступствы як на дадзеныя дзяржавы, так і на іншыя краіны. Так, блакада толькі ўзмацніла думку канфедэратаў, што еўрапейскія краіны пры пэўным узроўні баваўнянага голаду дапамогуць краіне ў вайне супраць Саюза [30]. У той жа час становішча ЗША ў вайне стала больш трывалым, бо блакада мела доўгатэрміновыя вынікі для абодвух бакоў. Так, для Вашынгтона блакада стала эфектыўным метадам барацьбы на моры з Канфедэрацыяй, што вынікае як з яе працягу, так і з яе вынікаў [5, p. 382–387]. Для КША жа меры, якія яны зрабілі ў адказ на блакаду, у доўгатэрміновай перспектыве пагоршылі іх становішча [31, p. 106].

Цэнтральнай жа праблемай у першы перыяд Грамадзянскай вайны была праблема рабства. Каб дастаткова дакладна даць фармулёўку і раскрыць змест праблемы рабаўладання, неабходна звярнуць увагу на дасецэсійнае развіццё Злучаных Штатаў. Рабства як форма гаспадарання адыграла ключавую ролю ў падзелу краіны на дзве секцыі – Поўнач і Поўдзень. Першапачаткова меўшы толькі эканамічны характар, выражаны ў рознанакіраванасці эканамічнага развіцця рэгіёнаў, дадзеная праблема паступова з 1820-1840-х гг. набыла сацыякультурную і палітычную афарбоўку, пераўтварыўшыся ў рухавік, які цягнуў краіну да вайны [32, c. 70–73].

Значнасць дадзенай праблемы пацвярджаюць наступныя дадзеныя. Па-першае, аналіз сецэсійных дакументаў паўднёвых штатаў паказвае, што лідары сецэсіі надзялялі значную ўвагу дадзенай праблеме [33, c. 207–208]. Па-другое, палітычныя дзеячы ЗША, якія імкнуліся прыпыніць раскол краіны, звязвалі гэта з вырашэннем дадзенай праблемы праз прыняцце адпаведнай папраўцы ў Канстытуцыю. Для гэтага былі зроблены шэраг захадаў, але безвыніковых. І, па-трэцяе, А. Лінкальн улічваў яе пры фарміраванне стратэгіі дзеянняў у дачыненні да паўднёвых штатаў [34, c. 40; 35, p. 261].

Злучаныя Штаты першымі сталі на шлях вырашэння дадзенай праблемы. Гэта стала магчымым дзякуючы спалучэнню ўнутраных і знешніх фактараў: умацаванню антырабаўладальніцкага руху ў краіне і міжнароднай кан'юнктуры, якая патрабавала ад Вашынгтона больш жорсткіх мераў для прадухілення інтэрвенцыі з боку еўрапейскіх краін [2, c. 108–114; 36, p. 84–85]. Да гэтага жа трэба дадаць і тое, што да часу выдання першай пракламацыі, т.б. к верасню 1862 г., варожыя бакі так і не змаглі дабіцца ваеннай перавагі [5, p. 454].

Менавіта сукупнасць дадзеных фактараў і ўплыла на тое, што 22 верасня 1862 г. А. Лінкальн выдаў ультыматум у выглядзе пракламацыі [19, c. 450]. У ім казалася, што калі да 1 студзеня 1863 г. КША не прыпыняць ваенныя дзеянні, то ён сваёй наступнай пракламацыяй вызваліць рабоў тых штатаў, якія ўваходзяць у склад Канфедэрацыі, але не ў астатніх паўднёвых штатаў, якія ўваходзілі ў склад ЗША [37].

Рэакцыя КША, як гэта не дзіўна, была неадназначнай. З аднаго боку, дадзеная пракламацыя трактавалася як апраўданне вайны і спроба ўмяшацца ў справы свабоднай краіны. Так, Кангрэс Канфедэрацыі прыняў рашэнне асудзіць пракламацыю А. Лінкальна. У адпаведнай рэзалюцыі абвяшчалася парушэнне звычаеў вядзення вайны, а таксама заклік да паўстання рабоў [38, p. 375–375, 393]. Як пісала адна з газет жаўнераў Канфедэрацыі, «цяпер любы чалавек, які ліча, што гэта не вайна за вызваленне чорнаскурых і што ўвесь курс янкі накіраваны не толькі на адмену рабства, але на падштурхненне да рабскіх паўстанняў, з'яўляецца або дуранам, або хлусам» [39, p. 137].

Прэзідэнт Дж. Дэвіс быў салідарны, што пракламацыя А. Лінкальна з'яўлецца крокам да рабскага паўстання. У пасланні да губернатара Джорджыі ён адзначыў, што ЗША плануюць дадаць да арміі і флота «афрыканскіх рабоў на поўдні, так як яны могуць быць у стане... ненасці...усе жахі рабскай вайны [40, p. 211]. Так жа лічыў былы федральны памочнік суддзі Дж. Кембэл, які ў тыя часы выконваў абавязкі ваеннага сакратара Канфедэрацыі: «наш вораг імкнеццца знайсці саюзніка сярод тых, хто жыве ў нашым уласным доме, і дадаць рабаўладанне да жахаў грамадзянскай вайны» [41, p. 980].

Аднак з іншага боку, некаторыя канфедэраты віталі пракламацыю А. Лінкальна, бо бачылі ў ёй магчымасць узмацнення рабаўладальніцкіх настрояў у краіне. Так, адзін з жаўнераў арміі Канфедэрацыі лічыў, што пракламацыя толькі ўзмацніць армію краіны, бо, паводле ягоных словаў, яна дасць «па крайняй меры, да трохсот тысяч жаўнераў нашаму ўраду», і што яна дакладна паказвае «менавіта для чаго была

развязана дадзеная вайна і якія намеры яе праклятых аўтараў» [39, p. 137].

Дадзеныя захады ніяк не паўплылі на прыняцце другой пракламацыі аб вызваленні рабоў, якая была выдадзена 30 снежня 1862 г. [42]. Яна тычылася толькі тых штатаў, што паўсталі супраць вярхоўнай улады ЗША. Яна з 1 студзеня 1863 г. аб'яўляла «вольнымі ўсіх асоб, якія знаходзяцца ў стане рабства ў адзначаных штатах і іх частках, і... што выканаўчая ўлада Злучаных Штатаў, уключаючы яе ваенныя і ваенна-марскія органы, будзе прызнаваць волю паказаных асобаў і садзейнічаць ёй» [42]. Пракламацыя прадугледжвала вызваленне рабоў ва ўсіх штатах Канфедэрацыі, дзе былі рабы, але не ў аналагічных штатах ЗША. Апроч таго, былым рабам дазвалялася ўступаць на вайсковую службу ў шэрагі войск Саюза [42], што стала для канфедэратаў своеасаблівым «доказам» імкнення ЗША да справакавання «рабскага паўстання».

Рэакцыя Канфедэрацыі на другую пракламацыю была простай, але зразумелай. Так, у сваім пасланні да Кангрэса 12 студзеня 1863 г. Дж. Дэвіс даў сваю адзнаку пракламацыі: «гэта (пракламацыя. — Я. Е.) дае ўсяму нашаму народу поўны і завяршальны доказ аб сапраўднай прыродзе праектаў партыі, якая прывяла да ўлады... сённяшняга прэзідэнта». Яна, паводле меркавання прэзідэнта КША, таксама «з'яўляецца сапраўднай заявай урада Злучаных Штатаў аб ягонай недзеяздольнасці падпарадкаваць Поўдзень сілай зброі» [43, p. 292–293]. Пазней, у сваіх пасляваенных успамінах ён да ўсяго вышэй напісанага дадаў, што дадзеная пракламацыя з'яўляецца «агрэсіяй і ўзурпацыяй урада Злучаных Штатаў супраць законаў Саюза» [44, p. 191].

Што цікава, напрыканцы вайны, у сакавіку 1865 г., лідары Канфедэрацыі пад націскам сістэмных праблем вырашылі пайсці на вельмі радыкальны крок, які не мог быць здзейснены ў пачатку існавання краіны – на вызваленне сваіх астатніх рабоў, якія, аднак мусілі служыць ў войску КША. Адпаведны закон быў прыняты 23 сакавіка 1865 г. Ён прадугледжваў стварэння каляровых палкоў для «забеспячэння дадатковых сіл для адбіцця ўварвання...» войскаў ЗША [45, p. 1161–1162]. Аднак гэта не выратавала Канфедэрацыю ад паразы ў вайне і ўласнага знішчэння.

Такім чынам, можна канстатаваць наступнае. Па-першае, вынікі барацьбы за «пагранічныя штаты» канчаткова вызначылі тэрытарыяльныя рамкі сіл ваюючых бакоў. Як і Канфедэрацыя, ЗША не змаглі дабіцца поўнага панавання над дадзенымі штатамі, што, аднак, аслабіла КША, а не Злучаныя Штаты. Па-другое, блакада паўднёвых партоў стала эфектыўнай мерай барацьбы з Канфедэрацыяй. Нарастанне яе эфектыўнасці за першыя гады вайны прывяло КША, па-першае, да ўзмацнення еўрапейскага вектару сваёй знешняй палітыкі, а па другое – да ініцыяванні пэўных мер у адказ, якія з большага не сталі эфектыўнымі. І, па-трэцяе, трэба адзначыць, што праблема рабаўладання мела пэўны ўплыў на Грамадзянскую вайну. Другая пракламацыя А. Лінкальна канчаткова вырашыла дадзеную праблему, а захады КША, якія былі імі зроблены ў адказ, не змаглі ўплыць на гэта. Адсюль, такім чынам трэба канстатаваць, што ЗША былі больш паспяховымі ў вырашэнні згаданых праблем, што і прадвызначыла іхнюю перамогу ў вайне.

## Спіс выкарастаных крыніц


1. Ермакоў, Я. С. Фарміраванне Канфедэратыўных Штатаў Амерыкі / Я. С. Ермакоў // Гісторык = Rerum scriptor : зборнік навуковых артыкулаў студэнтаў і магістрантаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Ф. Скарыны; рэд. калег.: В. А. Міхедзька (адказны рэдактар) [і інш]. – Гомель : ГДУ ім. Ф. Скарыны, 2016. – Вып. 2 – С. 95–100.
2. Куропятник, Г. П. Вторая американская революция / Г. П. Куропятник. – М.: Просвещение, 1961. – 346 с.
3. Hubbard, Ch. M. The Burden of Confederate Diplomacy / Ch. M. Hubbard. – University of North Carolina Press, 2000. – 272 p.
4. J. Davis to the Congress of the Confederate States, July 20, 1861 // A compilation of the messages and papers of the confederacy: including diplomatic correspondence 1861-1865: in 2 vol. / ed. by James D. Richardson. – Nashville: United States Publishing Co., 1904–1905. – Vol. 1. – P. 117–124.
5. McPherson, J. M. Battle Cry of Freedom: The Civil War Era / J. M. McPherson. – New York: Oxford University Press, 1988. – 909 p.
6. B. Magoffin to Hon. Simon Cameron, Secretary of War // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D.C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 3, Vol. 1. – P. 70.
7. J. W. Ellis to Hon. Simon Cameron, April 15, 1861 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D. C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 3, Vol. 1. – P. 72.
8. J. Letcher to Hon. Simon Cameron, April 16, 1861 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D.C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 3, Vol. 1. – P. 76.
9. I. G. Harris to Hon. Simon Cameron, April 17, 1861 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D.C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 3, Vol. 1. – P. 81.

10. C. F. Jackson to Hon. Simon Cameron, April 17, 1861 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D.C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 3, Vol. 1. – P. 82–83.
11. J. A. Andrew to Gen. W. Scott, April 21, 1861 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D.C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 3, Vol. 1. – P. 97–100.
12. S. Cameron to the President of The United States, July 1, 1861 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D.C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 3, Vol. 1. – P. 301–100.
13. Davis, J. The Rise and Fall of the Confederate Government: in 2 vol. / J. Davis. – New York: Thomas Yoseloff, 1958. –Vol. 1. – 707 p.
14. Carlisle, R. P. Civil War and Reconstruction / R. P. Carlisle. – Infobase Publishing, 2007. – 465 p.
15. Иванов, Р. Ф. Авраам Линкольн и гражданская война в США / Р. Ф. Иванов. – М.: ЭКСМО: Алгоритм-книга, 2004. – 446 с.
16. Исаев, С. А. Конфедеративные Штаты Америки: состав территории и политико-правовое устройство / С. А. Исаев // Americana: сборник научных трудов, посвященный 150-летию начала Гражданской войны в Северной Америке. – Волгоград, 2011. – Вып. 12. – С. 108–124.
17. Бурин, С. Н. На полях сражений гражданской войны в США / С. Н.Бурин. – М.: Наука, 1988. – 176 с.
18. J. Davis to Congress of the Confederate States, Richmond, November 18, 1861 // The Papers of Jefferson Davis: in 13 vol. / Edited by Lynda L. Crist and Mary S. Dix. – Baton Rouge: Louisiana State University Press, 1992. – Vol. 7. – P. 412421.
19. История США: в 4 т. Т. 1: История США (1607-1877) / под ред. Н. Н. Болховитинова [и др.]. – М.: Наука, 1983. – 688 с.
20. Eaton, C. A History of the Southern Confederacy / C. Eaton. – New York: The Macmillan Company, 1954. – 351 p.
21. Davis, J. A proclamation, April, 17, 1861 / J. Davis // A compilation of the messages and papers of the confederacy: including diplomatic correspondence 1861-1865: in 2 vol. / ed. by James D. Richardson. – Nashville: United States Publishing Co., 1905. – Vol. 1. – P. 60–62.
22. Hay, J.M. Nicolay, J.G., Abraham Lincoln: A History: in 10 vols. / J.M. Hay, J.G. Nicolay. – Cossimo Clasics, 2009. – Vol. 4. – 550 p.
23. Lincoln, A. Declaring a Blockade of Ports in Rebellious States, April 19, 1861 [Electronic resource] / A. Lincoln // The American Presidency Project. – Mode of access: http://www.presidency.ucsb.edu/ws/index.php?pid=70101. – Date of access: 23.09.2018.
24. Lincoln, A. Extension of Blockade to Ports of Additional States, April 27, 1861 [Electronic resource] / A. Lincoln // The American Presidency Project. – Mode of access: http://www.presidency.ucsb.edu/ws/index.php?pid=70112. – Date of access: 23.09.2018.
25. Lincoln, A. Prohibiting Commercial Trade with States in Rebellion, August 16, 1861 [Electronic resource] / A. Lincoln // The American Presidency Project. – Mode of access: http://www.presidency.ucsb.edu/ws/index.php?pid=69990. – Date of access: 23.09.2018.
26. J. Davis to the Congress of the Confederate States, April 29, 1861 // A compilation of the messages and papers of the confederacy: including diplomatic correspondence 1861-1865: in 2 vols. / ed. by James D. Richardson. – Nashville: United States Publishing Co., 1905. – Vol. 1. – P. 63–82.
27. Callahan, J. M. The diplomatic history Southern Confederacy / J. M. Callahan. – Baltimore: The Johns Hopkins Press, 1901. – 304 p.
28. Пастусяк, Л. Внешняя политика Конфедерации южных штатов во время гражданской войны / Л. Пастусяк // Американский ежегодник. – 1978. – С. 235–248.
29. An Act to prohibit the exportation of cotton from the Confederate States, except through the seaports of said States; and to punish persons offending therein, May 21, 1861 // The Statutes at Large of the Provisional Government of the Confederate States of America / ed. by J. M. Matthews. – Printed to Congress, 1864. – P. 152-153.
30. The Queen's Proclamation and the Blockade [Electronic resource] / Charlston Mercury, June 4, 1861 // Google News. – Mode of access: https://goo.gl/4M5kvU. – Date of access: 23.09.2018.
31. Callahan, J. M. The diplomatic history Southern Confederacy / J. M. Callahan. – Baltimore: The Johns Hopkins Press, 1901. – 304 p.
32. Ермакоў, Я. С. Перадумовы ўтварэння Канфедэратыўных штатаў Амерыкі / Я. С. Ермакоў // Творчество молодых 2016 : сборник научных работ студентов, магистрантов и аспирантов : в 4 ч. / Министерство образования Республики Беларусь, Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины ; ред.коллегия: О. М. Демиденко [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2016. – Ч. 3. – С. 70–73.
33. Ермакоў, Я. С. Ідэалагічнае абгрунтаванне сэцэсіі паўднёвых штатаў ЗША / Я. С. Ермакоў // Молодёж в науке – 2016 : сборник материалов Международной конференции молодых ученых (Минск, 22–25 ноября 2016 г.). в 2 ч. Ч. 2: Биологические, гуманитарные, медицинские, физико-математические, физико-технические, химические науки / Нац. акад. Наук Беларуси. Совет молодых ученых; редкол. : В. Г. Гусаков (гл.ред) [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2017. – С. 205–210.
34. Ермакоў, Я. С. Спробы мірнага вырашэння сэцэсійнага крызісу ў Злучаных Штатах Амерыкі / Я. С. Ермакоў // Дни студенческой науки : материалы XLV студенческой научно-практической конференции, Гомель, 17–18 мая 2016 года : в 2 ч. / Министерство образования Республики Беларусь, Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины ; ред.коллегия: О. М. Демиденко [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2016. – Ч. 2. – С. 40.
35. Clair, S. D. St. Slavery as a diplomatic factor in Anlo-American relations during the Civil War / S. D. St. Clair // The Journal of Negro History. –1945. – Vol. 30, № 3. – P. 260–275.
36. Jones, H. Abraham Lincoln and a New Birth of Freedom: The Union and Slavery in the Diplomacy of the Civil War / H. Jones. – University of Nebraska Press, 2002. – 236 p.

37. Lincoln, A Preliminary Emancipation Proclamation, September 22, 1862 [Electronic resource] / A. Lincoln // National Archives and Records Administration. – Mode of access: https://clck.ru/ERMNZ. – Date of access: 23.09.2018.
38. Journal of the Congress of the Confederate States of America: in 7 vols. / Washington, D.C.: Goverment Printing Office, 1904–1905. – Vol 2. – 542 p.
39. Masur, L. P. Lincoln's Hundred Days: The Emancipation Proclamation and the War for the Union / L. P. Masur. – Belknap Press: Harvard University Press, 2014. – 384 p.
40. The President of the Confederate States to J. E. Brown, November 26, 1862 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D. C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 4, Vol. 2. – P. 211–212.
41. J.A. Campbell to Maj. Gen. S. Jones, October 27, 1862 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D.C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 1, Vol. 16, Part 2. – P. 979–980.
42. Lincoln, A The Emancipation Proclamation, January 1, 1863 [Electronic resource] / A. Lincoln // National Archives and Records Administration. – Mode of access: https://goo.gl/uPdhQM. – Date of access: 23.09.2018.
43. J. Davis to the Congress of the Confederate States, January 12, 1863 // A compilation of the messages and papers of the confederacy: including diplomatic correspondence 1861-1865: in 2 vols. / ed. by James D. Richardson. – Nashville: United States Publishing Co., 1905. – Vol. 1. – P. 276–297.
44. Davis, J. The Rise and Fall of the Confederate Government: in 2 vols. / J. Davis. – New York: D. Appleton and Company, 1881. – Vol. 2. – p. 898.
45. Confederate Law Authorizing the Enlistment of Black Soldiers, as Promulgated in a Military Order, Richmond, March 23, 1865 // The War of the Rebellion: A Compilation of the Official Records of the Union and Confederate Armies: in 128 vols / Washington, D. C.: Goverment Printing Office, 1880–1901. – Ser. 4, Vol. 3. – P. 1161–1162.

***Дата подачи статьи: 28.09.2018***